Kwartalnik Historii Kultury Materialnej 63 z. 4 (2015), pp. 623-628

*Вольга Бабкова*

# Зборнікі шляхецкіх тастаментаў другой паловы XVI ст. Выданне і падрыхтоўка.

У 2012 г. адбылася падзея, важная не толькі для калектыва Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, але і для шырокага кола даследчыкаў-медыевістаў. Пабачыў свет зборнік дакументаў з архіўнай серыі: Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII ст. — Тастаменты шляхты і мяшчанаў Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг НГАБ).

Праца над зборнікам адбывалася сіламі трох супрацоўнікаў аддзела старажытных актаў напрацягу амаль 10 гадоў. У якасці навуковага кіраўніка нашага праекта быў запрошаны загадчык сектара крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі — кандыдат гістарычных навук Аляксандр Доўнар. Трэба адзначыць, што ніхто з трох складальнікаў зборніка не меў навуковай ступені, але затое — вялікі досвед працы са старажытнымі дакументамі. Наш зборнік стаў своеасаблівым вынікам шматгадовай працы ў аддзеле старажытных актаў.

Ідэя зборніка паўстала ў момант распрацоўкі актавых кніг, якая з'яўляецца асноўным відам дзейнасці аддзела старажытных актаў. Агулам у аддзеле расчытаныя і распрацаваныя каля 75 актавых кніг XVI — пач. XVII ст. Сярод іх — кнігі Берасцейскага гродскага і земскага судоў, Віцебскага земскага суда, Менскага гродскага суда, Слонімскага гродскага і земскага судоў, Магілёўскага магістрата ды іншыя. На кожную з іх быў складзены навукова-даведачны апарат. На жаль, не захаваліся актавыя кнігі XVI ст. Віцебскага, Полацкага, Навагрудскага, Ашмянскага, Пінскага гродскіх судоў, Менскага, Навагрудскага, Ашмянскага, Полацкага, Пінскага земскіх судоў і магістрацкіх кніг большасці гарадоў Беларусі.

Сярод шэрагу самых размаітых дакументаў, упісаных у судовыя кнігі, тастаменты вылучалюцца як формай, так і сваім зместам. Гэтая разнавіднасць дакументаў адносіцца да той катэгорыі гістарычных крыніц, з якой выразна гучыць голас самога чалавека.

Менавіта такое бачанне аб'яднала нас, трох супрацоўнікаў аддзела: мяне, тагачасную загадчыцу, галоўнага архівіста Ірыну Бобер, галоўнага палеографа Альбіну Францаўну Аляксандраву для ўдзелу ў даволі амбітным праекце, які самі задумалі і пачалі рэалізоўваць.

Такім чынам, з усіх распрацаваных актавых кніг XVI ст. намі былі выбраны 8 архіўных фондаў, 30 актавых кніг і 115 дакументаў-запісаў апошняй волі за 1559–1600 гг. Неапублікаванымі аказаліся каля 15ці дакументаў, па прычыне моцнай пашкоджанасці і фрагментарнасці тэксту. (Тры дакументы мы ўпусцілі, і яны будуць змешчаны ў другой частцы зборніка).

Апошні тастамент у зборніку (№116) пана Шчаснага Вельямінавіча-Руцкага, бацькі уніяцкага мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і Усёй Русі Іосіфа Вельямінавіча-Руцкага быў выяўлены загадчыкам аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі, кандыдатам гістарычных навук Д.В.Лісейчыкавым у фондзе Навагрудскага павятовага суда. Большая частка дакументаў трапіла ў Навагрудскі павятовы суд з былога архіва уніяцкіх мітрапалітаў, які захоўваўся ў Вільні.

Усяго ў НГАБ налічваецца больш за 6 тыс. актавых кніг XV–XVIII стст. З іх за XV ст. — 1 кніга (Драгічынскі земскі суд), за XVI ст. — 230 кніг, за XVII ст. — каля 800 кніг, за XVIII ст. — каля 5000 актавых кніг. Трэба адзначыць, што больш за 500 актавых кніг напісаны на лацінскай мове. Гэта кнігі Драгічынскага, Браслаўскага, Бельскага, Суражскага

пав. Астатнія актавыя кнігі напісаны на старабеларускай (практычна ўсё XVI і перш. палова XVII ст) і старапольскай мовах. Каля 60% актавых кніг знаходзяцца ў добрым фізічным стане. На 82% актавых кніг створаны мікрафотакопіі.

* * *

На самым пачатку працы над зборнікам, мы недастаткова ўяўлялі складанасці, з якімі давядзецца сутыкнуцца ў працэсе. Больш за тое, напачатку ясна не ўяўлялі структуру і прынцыпы публікацыі дакумента. Існавала ідэя рыхтаваць да публікацыі толькі тэкст самога тастамента.

Але пазней, улічваючы тое, што тастаменты браліся непасрэдна з актавых кніг гродскіх, земскіх і магістрацкіх судоў, вырашылі дакументы ў зборніку падваць цалкам, з улікам суправаджальнага запісу аб актыкацыі. Гэта дало магчымасць атрымаць шмат дадатковай інфармацыі пра тэстатара, а таксама пра парадак актыкацыі дакумента ў канцылярыях павятовых судоў. То бок, не парушыць цэласнасаць актавага дакумента, захаваць „павагу да дакумента".

Нягледзячы на заўважную пубікатарскую дзейнасць НГАБ, у апошнія дзесяцігоддзі ў архіве публікаваліся пераважна гістарычныя крыніцы найноўшага часу. Таму, распачынаючы працу над зборнікам, мы карысталіся досведам, які раней напрацавалі даследчыкі Акадэміі навук, Беларускага дзяржаўнага ўніверэсітэту пры падрыхтоўцы дакументаў перыяду Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай. Таксама цікавіліся археаграфічнымі працамі калегаў з Літвы, Украіны, Польшчы. На Навуковых Радах, якія адбываюцца ў архіве, раіліся з вядомымі беларускімі крыніцазнаўцамі і археографамі.

Такім чынам, наш зборнік, які ўключае ў сябе 116 дакументаў, не з'яўляецца корпусным выданнем тастаментаў другой паловы 16 ст., ён пабудаваны па выбарачным прынцыпе. Усе дакументы ўзятыя з актавых кніг павятовых судоў, куды яны ўносіліся (актыкаваліся), і набывалі такім чынам юрыдычную сілу.

Дакументы ў выданні размешчаны згодна тапалагічна-храналагічнаму прынцыпу. Раздзелы зборніка складаюцца з матэрыялаў пэўных судоў (земскага, гродскага, магістрата), а ўнутры дакументы падаюцца паводле храналогіі.

У выніку зборнік тастаментаў пабачыў свет у дзяржаўным выдавецтве „Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" у Мінску. Сумесная праца ў гэтым выдавецкім праекце прынесла значны плён, дзякуючы кваліфікацыі супрацоўнікаў выдавецтва.

У яго кіраўніцтва таксама існавалі некаторыя патрабаванні да нашага выдання, з улікам таго, што асноўная рэалізацыя кнігі мусіла адбывацца праз выдавецтва. Таму існавала зацікаўленасць прадставіць гістарычнае выданне такім чынам, каб пазнаёміць з унікальнымі дакументамі больш шырокае кола чытачоў.

Будучы ўнікальнай па інфарматыўнасці гістарычнай крыніцай, тастаменты прадстаўляюць матэрыял для вывучэння ментальнасці людзей рознага стану. Сярод прадстаўленых у нашым зборніку тастаментаў 104 належаць прадстаўнікам шляхецкага саслоўя, 12 — мяшчанскага. (Тастаменты сялян укладальнікамі зборніка пакуль не выяўлены). Пераважная большасць аўтараў тастаментаў не з'яўлялася элітай тагачаснага грамадства і складалася з прадстаўнікоў сярэдняй шляхты-зямянаў, што валодалі некалькімі вёскамі, і мяшчанаў. З улікам таго, што амаль не захаваліся фамільныя зборы гэтай катэгорыі насельніцтва, тастаменты даюць багатую інфармацыю аб маёмасных і сямейных стасунках у іх асяродку. У зборніку прадстаўлены таксама тастаменты некаторых асобаў вышэйшага стану, якія займалі розныя кіруючыя пасады і мелі важнае значэнне ў сістэме дзяржаўнага кіравання, гэта:

— смаленскі ваявода, мінскі і пінскі староста Васіль Тышкевіч,

— каралеўскі маршалак, ашмянскі падкаморы, неманоіцкі дзяржаўца Ян Палускі Доўгвід,

— слонімскі староста Міхал Валовіч,

— лоўчы Віцебскага ваяводства Станіслаў Лускіна,

— віцебскі гараднічы Багдан Янушкоўскі,
— князі Эмануіл Шуйскі і Шчасны Свірскі,
— канцлерыная ВКЛ Дарота Фірлеева Львовая Сапежыная,
— маршалак зямлі Валынскай, валадзімірскі староста Пётр Кішка,
— гомельская старосціная Барбара Сапежыная, маці княжны Зафеі Слуцкай,
— магілёўскі бурмістр Кузьма Есманавіч, ды іншыя.

Аўтарамі 84 дакументаў апошняй волі былі мужчыны, 32 — жанчыны. Пераважня большасць тастатараў сыходзілі з гэтага свету ў выніку „обложной хворобы", значная частка — у сталым узросце; дзьве жанчыны памерлі падчас цяжарнасці („будучы обвезана плодом, а помнечы на припадку такъ щастливые, яко и нещастливые отменности того света", „обтяжона тяжкостю беремени невестего"), два мужчыны — у выніку гвалтоўнага нападу ці то двубою.

Сустракаюцца тастаменты, напісаныя абачліва загадзя, без прычынаў, звязаных са стратай здароўя, верагодна, з разуменнем небяспечнасці і хуткаплыннасці навакольнага жыцця, раптоўнасці прыходу „злодея панского" — смерці, якая па словах зямяніна Фёдара Плашчынскага (Менск, 1641 г.): „[...] заўсёды за намі як злодзей ходзіць, спакваля дом мізэрнага цела нашага подкопвае і разбурае, і яго з маёмасцю, то бок з душой нашай разлучае"[1].

Паводле веравызнання прадстаўленыя тастаменты падзяляюцца наступным чынам: праваслаўных — 55, каталікаў — 21, пратэстантаў — 3, мусульман — 2. 35 тастаментаў зборніка маюць нявызначаную рэлігійную прыналежнасць.

Увогуле, сведчаннем канфесійнай прыналежнасці ў тастаментах найчасцей выступае тая частка тэксту, дзе гаворка ідзе пра распараджэнні, якія тычацца „душы і цела". Тут агаворвалася месца апошняга спачыну ў звязку з хрысціянскай святыняй: царквой, манастыром, касцёлам, зборам. Сведчаннем магла таксама выступаць згадка прысутнасці сярод сведкаў тастамента свяшчэнніка-духоўніка пэўнай царквы, каплана ці вікарыя.

Каля 25 тастатараў выбралі месцам свайго апошняга спачыну цэрквы, 12 — касцёлы. Двое прасілі быць пахаванымі ў манастырах. Найчасцей гучала просьба быць пахаванымі побач з продкамі і сямейнікамі („[...] подле родичов звычаем хрестиянским", „на грунце моем на горе где дочка Марухна", „подле отцов", „подле малжонки"). Згадваюцца таксама і іншыя месцы пахавання: „на горцы [...]", пад грушай каля дарогі, у маёнтку, за дваром, „подле двух верб".

У прадстаўленых дакументах тастаменты найчасцей называліся: „тастамент", „дастамент", „дэстамент", „тэстамент", і зрэдку „духовница".

Дакументы актавых кніг павятовых судоў часам даюць магчымасць прасачыць далейшы лёс выканання ці невыканання сваякамі нябожчыка ўмоваў тастамента.

Актавыя матэрыялы ўтрымліваюць багатую інфармацыю пра аўтараў актаў апошняй волі, пра абставіны іх жыцця і смерці. Гэтак, у фондзе „Берасцейскі гродскі суд", дзе быў у свой час зафіксаваны тастамент пана Івана Бялеўскага, былі заактыкаваныя сазнанне і квіт markdown вознага пра абвяшчэнне тастаменту і ліквідацыю сыгнету нябожчыка пад час яго пахавання[2], ды шмат іншага.

Прадстаўленыя ў зборніку дакументы, сведчаць пра існаванне на нашых землях даўняй культуры напісання тастаментаў, страчаннай у пазнейшыя часы ў выніку розных палітычных трансфармацый найноўшага часу.

Пры падрыхтоўцы тэкстаў дакументаў мы ў асноўным кіраваліся *Метадычнымі рэкамендацыямі па публікацыі рукапісных актавых кірылічных крыніц у Беларусі (XIII–XVIII стст., перыяд Вялікага княства Літоўскага*, Аўтар, складальнік А.І. Груша (Мінск 2003).

Да тэкстаў у зборніку дадаецца навукова-даведачны апарат: спіс скарачэнняў, тэрміналагічны слоўнік, асабовы і геаграфічны паказальнікі; табліца выкарыстаных архіўных

[1] НГАБ. Ф.1727. Воп. 1. Спр.3. Арк. 195–196 адв.

[2] НГАБ. Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 7 адв.–8.

фондаў. Пры складанні навукова-даведачнага апарата намі быў скарыстаны менавіта архіўны досвед. Асабовы і геаграфічны паказальнікі былі складзены згодна досведу, назапашанаму ў аддзеле старажытных актаў.

То бок, у асабовым і геаграфічным паказальніках былі зафіксаваныя ўсе найменні асобаў і тапонімы, якія сустракаюцца ў тэксце дакументаў. Асноўныя згадкі кожнай персаналіі і ўсіх тапонімаў ў паказальніках вылучаны тлустым шрыфтам і пададзены ў назоўным склоне ў алфавітным парадку згодна правілаў сучаснай беларускай арфаграфіі з захаваннем арыгінальнай формы, у якой яны фігуруюць у крыніцы. (напр. Астрозкі Касценцін Касценцінавіч; Зафея, Зафііца, Захфея). Пасля асноўнай формы пададзены ўсе варыянты напісання найменняў ў дакуменце, (напр. Острозкии, Остроскии Костентин, Костенцин, Костантын Костентинович). Такая практыка дазваляе выпрацаваць адпаведныя беларускія ўзоры ўжывання даўніх найменняў для выкарыстання ў навуковай і папулярнай літаратуры.

Звесткі аб асобах даюцца па дадзеных самога дакумента. У сувязі з гэтым рэканструяваны імёны асобаў, якія знаходзіліся ў сваяцкіх сувязях з тастатарам. Вынікам чаго стала магчымым наглядна ўявіць роднасныя адносіны ў межах адной сям'і. Усе рэканструяваныя імёны пададзены ў дадатковых спасылках.

Кожная асоба ўнесена ў паказальнік па прозвішчу, а пры яго адсутнасці на імя і пададзена як дапаможная адсылка на імя па-бацьку (напр. Мікалаевіч Лаўрын гл. Лаўрын Мікалаевіч). Падвойнае прозвішча адзначалася як пад першым, так і пад другім прозвішчамі (напр. Казярадскі Багавіцін Міхайла Іванавіч — гл. Багавіцін Казярадскі Міхайла Іванавіч).

Зафіксаваныя ў актах найменні на -іч падаюцца ў паказальніку як імя па-бацьку, за выключэннем вядомых шляхецкіх прозвішчаў (напр. Вайніловіч, Глябовіч, Тышкевіч, Зяновіч і інш.). Падставай для такога рашэння стала шматгадовая практыка архіўнай працы з актавым матэрыялам, а таксама дадзеныя спецыяльнага раздзела мовазнаўства — антрапанімікі, паводле якіх прозвішчы на Беларусі ў асноўным трывала з'явіліся толькі ў XVII–XVIII ст.

Старажытныя назвы тапонімаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на сучасны лад не пераводзілся (напр. Менск, Берасце, Івачэвічы і г.д.). Лакалізацыя па сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле не праводзілася.

Структура геаграфічнага паказальніка сфарміравана такім чынам, што ўсё датычнае асноўнага аб'екта (вуліцы, прадмесці, цэрквы, касцёлы і г.д.) выносілася падпунктамі пад асноўнай назвай.

* * *

Цяпер у аддзеле старажытных актаў НГАБ ідзе падрыхтоўка другой часткі зборніка, якая будзе прысвечаная тастаментам, заактыкаваным ў актавых кнігах Гарадзенскага земскага суда другой паловы XVI ст. Іх было выяўлена больш за 130 (з 1554 па 1594 гг.), што цалкам укладаецца ў самастойную частку ў нашым праекце.

Вельмі хацелася б завяршыць гэтую працу за больш кароткі тэрмін. З аднаго боку, праца аблегчана дзякуючы папярэдняй практыцы. З іншага боку — хацелася б улічыць усе памылкі, пазбегнуць недакладнасцяў, якія, вядома ж, былі ў першым выданні. У гэтым сэнсе вельмі карысным былі б грунтоўныя рэцэнзіі, прафесійныя парады калег-гісторыкаў, археографаў, крыніцазнаўцаў.

У пераважнай большасці выяўленыя тастаменты належаць зямянам Гарадзенскага павету, але ў зборніку таксама будуць змешчаны акты апошняй волі віленскага кашталяна, канцлера ВКЛ, старосты берасцейскага і кобрынскага Астафія Валовіча, троцкага паніча, бельскага старосціча пана Канстанціна Хадкевіча, каралеўскага маршалка, гарадзенскага старосты Івана Іванавіча Валовіча, мітрапаліта Анісіфора Дзевачкі, індурскага вікарыя кс. Мацея Грыўны, ляйпунскага ўрадніка Матыса Міхноўскага, гарадзенскага гродскага суддзі Суліяна Багуфала Дарашковіча, каралеўскага ляснічага Фронцка Чэхалеўскага, земскага

харужага Богуша Міцуты, каралеўскага дваранiна Сцыпіяна Кампы, аліцкага плябана, князя Яна Снарскага, ды іншых.

Агулам у гарадзенскім зборніку будзе прадстаўлены 97 мужчынскіх і 36, жаночых тастаментаў. 19 дакументаў напісаныя на польскай мове, 14 з выяўленых тастаментаў захаваліся не вельмі добра, хаця трэба адзначыць, што агулам актавыя кнігі гарадзенскага земскага суда збольшага захаваліся ў добрым стане.

Не выключана, што склад зборніка гарадзенскіх тастаментаў будзе пашыраны за кошт дзясятка тастаментаў Віленскага гродскага суда, якія былі выяўлены ў кнізе Віленскага гродскага суда за 1593–1594 гг. (ф. 356, воп. 2, адз.зах. 13). Копія гэтай кнігі была атрымана намі з Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў і захоўваецца ў НГАБ як КМФ-32. У кнізе — 954 аркуша. Кніга напісана на старабеларускай мове, была часткова адрэстаўравана ў 40-х гадах і знаходзіцца ў задавальняючым фізічным стане. Цяпер на дакументы гэтай кнігі складаецца ўнутраны вопіс і яна неўзабаве будзе ўведзена ў навуковы ўжытак.

Вядома, што ўсходняя частка былога Віленскага павета знаходзілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У Віленскі гродскі суд па розных патрэбах звярталася не толькі мясцовая віленская шляхта, але і прадстаўнікі шляхецкага стану ўсяго ВКЛ, якія знаходзіліся ў Вільні, як сталіцы ВКЛ па розных грамацкіх, судебных і прыватных пытаннях.

У выпадку, калі мы спынемся на ідэі далучыць тастаменты з віленскай кнігі ў зборнік, ягоная назва будзе гучаць інакш.

Няма патрэбы казаць пра значэньне такога віда гістарычнай крыніцы, як тастамент. Як і ўвогуле пра важнасць і неабходнасць выдання старажытных дакументаў. Згадайма словы М.Улашчыка: „Выдадзены нават самым прымітыўным спосабам стары дакумент застанецца, у той час як ад арыгінала можа не застацца і сьледу”.

Самі тагачасныя аўтары тастаментаў, „присмотревшисе одменности часов и веков сего света» выдатна разумелі значэнне памяці і пісьма, якое гэтую памяць фіксуе. „Память чалавечая вельми кароткая, кали б письмом падпирана не была». Таму напісанне тастаментаў уважалася за справу „годную і патрэбную”. Тое самае можна сказаць і пра справу выдання гістарычных дакументаў.

Шматгадовая праца з тастаментамі, дае асабіста для мяне значна больш за набыццё чыста прафесійнага досведу ў археаграфіі ды іншых сумежных дысцыплінах. Гэтая праца дала мне болей ведаў пра чалавека як такога і пра жыццё чалавека ў часе, якое і ў XVI і ў XXI стагоддзях утрымлівае невымоўную таямніцу.

Adres Autorki:
Volga Babkova
Загадчык аддзела старажытных актаў
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
ул. Кропоткина 55
220002 Минск
vbabkovaja@gmail.com

## ZBIORY TESTAMENTÓW SZLACHECKICH Z DRUGIEJ POŁOWY XVI W. OPRACOWANIE I EDYCJA

Artykuł prezentuje najnowszy tom z serii „Białoruś w aktach z XVI–XVIII w.”, poświęcony przechowywanym w zbiorach Narodowego Historycznego Archiwum Białorusi testamentom szlachty i mieszczan z drugiej połowy XVI w. Zbiór przygotowały archiwistki z NHAB: Wolga

Babkowa, Iryna Bober i Albina Aljaksandrowa. Tom zawiera 116 dokumentów z lat 1559–1600. Znajdują się w księgach sądów grodzkich i ziemskich w Brześciu, Mińsku, Nowogródku, Słonimiu i Witebsku oraz w księgach miasta Mohylewa. Opublikowano wszystkie zachowane testamenty, z wyjątkiem kilkunastu uszkodzonych.

Autorka charakteryzuje zawartość wspomnianych powyżej ksiąg. Pokrótce informuje o specyficznych problemach pracy nad przygotowaniem wydawnictwa, zasadach konstrukcji indeksów — geograficznego i osobowego. Charakteryzuje też grupę autorów testamentów. Liczebnie przeważają wśród nich mężczyźni (84 testamenty) oraz wyznawcy prawosławia (55). Katolicy (21) tworzą znaczącą mniejszość; protestantów i wyznawców islamu jest kilku. Większość testatorów należała do średniej szlachty — posesjonatów, dwunastu to mieszczanie. Wśród spadkodawców znajdujemy tylko około 10 przedstawicieli elity władzy — Kiszków, Sapiehów, burmistrza Mohylewa Esmanowicza.

Autorka przedstawia także problemy związane z pracą nad częścią drugą edycji, która ma zawierać około 140 testamentów szlachty powiatu grodzieńskiego z lat 1554–1594, zachowanych w księgach sądu ziemskiego w Grodnie. Struktura grupy testatorów jest podobna do opisanej w wydanym już tomie. Także tu wśród testamentów szlachty średniozamożnej znajdujemy kilka dokumentów magnackiej elity — Chodkiewiczów i Wołłowiczów. Dziewiętnaście dokumentów pisanych jest po polsku.

## THE EDITION OF TWO COLLECTIONS OF TESTAMENTS OF THE NOBILITY FROM THE SECOND HALF OF THE 16TH C.


The article presents the newest publication from the series – Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII ст. [Belarus in documents from the 16th–18th c.], devoted to the testaments of nobles and burghers from the second half of the 16th c. preserved in the National Historical Archive of Belarus. The book was prepared by Volga Babkova, Iryna Bober and Albina Alyaksandrova from the National Historical Archive of Belarus. It contains 116 documents from the years 1559–1600, recorded in the books of municipal and nobility courts in Brest, Minsk, Nowogródek, Słonim and Witebsk, and in the municipal books of Mohylew. The volume includes all the surviving testaments except of several badly damaged ones.

The author discusses the contents of the above-mentioned books and then outlines particular problems encountered in the preparation of such a publication as well as the rules of constructing indexes of names and places. She also describes the testators, the majority of whom were men (84 testaments) and members of the Orthodox Church (55). Catholics (21) were a significant minority; there were also several Protestants and Muslims. Most of the testators represented the middle-rank nobility, i.e. owners of landed estates; twelve were burghers. Only ten of the testators belonged to the ruling elite: examples are members of the Sapieha and Kiszka magnate families and the mayor of Mohylew, named Esmanowicz.

The author also mentions problems encountered in the preparation of another volume, which is planned to include about 140 testaments of the nobility from the district of Grodno from the years 1554–1594, recorded in the books of the nobility court in Grodno. The structure of the group of the testator is similar to the one reflected by the first volume: among the testaments of middle-rank nobility there are also several testaments of the magnate elite — the Chodkiewicz and Wołłowicz families. Nineteen of the documents were written in Polish.



Translated by
*Izabela Szymańska*